тельное повышение статуса узбекского языка, одновременно гарантируя право на использование других языков. Выявленные тенденции – активное продвижение узбекского языка, поддержка языков меньшинств и развитие многоязычия – отражают стремление к гармоничной языковой среде. Однако существуют вызовы: необходимость подготовки кадров, хорошо владеющих государственным языком, потребность в разработке методик преподавания узбекского языка для национальных меньшинств, широкое развитие использования языков национальных меньшинств в сфере образования [5].

Успешная реализация языковой политики, направленной на эффективную межкультурную коммуникацию и национальное единство, важна для устойчивого развития страны. Дальнейшие исследования позволят углубить понимание языковых процессов и разработать эффективные стратегии языкового планирования, а также проводить постоянный мониторинг актуальной языковой ситуации.


1. Конституция Республики Узбекистан. URL: https://lex.uz/docs/6445147. (дата обращения: 22.02.2025).
2. Закон Республики Узбекистан о государственном языке. URL: https://www.lex.uz/acts/121433 (дата обращения: 23.02.2025).
3. Беликов, В.И. Социолингвистика / В.И. Беликов, Л.П. Крысин. – М.: Российский государственный гуманитарный университет, 2001. – 439 с.
4. Руссо, Л.-Ж. Языковая политика в современном мире / Л.-Ж. Руссо. – СПб.: Златоуст, 2007. – С. 97–121.
5. Маслова, В.А. Коммуникация как способ существования человека в социуме / В.А. Маслова. – Текст: электронный // Репозиторий ВГУ имени П. М. Машерова. – URL: https://rep.vsu.by/handle/ 123456789/30614 (дата обращения 03.03.2025). – Электрон.версия ст. из: Актуальные проблемы профессионального образования в Республике Беларусь и за рубежом: материалы IX междунар. науч.-практ. конф., Витебск,17 дек. 2021 г. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2021. – С. 176–178.


## МОЎНА-СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВЕРША АЛЕНЫ БАГАМОЛАВАЙ “СЫНУ”


***Бычкова А.М.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт


Алена Багамолава – адна з яркіх прадстаўніц сучаснай беларускай літаратуры, якая ў сваёй творчасці спалучае глыбокую эмацыйнасць з унікальным стылістычным падыходам. Яе вершы, насычаныя разнастайнымі тэмамі, адлюстроўваюць не толькі асабістыя перажыванні пісьменніцы, але і агульначалавечыя каштоўнасці, што робіць іх блізкімі і актуальнымі для шырокага кола чытачоў. *Актуальнасць* тэмы нашага даследавання абумоўлена магчымасцю ахарактарызаваць моўна-стылістычныя асаблівасці верша “Сыну”, што дазволіць выявіць адметнасць ідыястылю аўтара, спосабы перадачы яго пачуццяў і разваг. *Мэта* даследавання – вызначэнне і характарыстыка моўна-стылістычных асаблівасцей верша Алены Багамолавай “Сыну”, выяўленне ролі вобразна-выяўленчых сродкаў у названым творы.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужыў верш Алены Багамолавай “Сыну” [1, с. 25]. Падчас аналізу былі выкарыстаны структурны, функцыянальны і апісальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На наш погляд, верш “Сыну” адносіцца да інтымнай лірыкі з элементамі філасофскай: у творы аўтар не толькі апісвае свае перажыванні за сына, але і гаворыць, што беражэ свайго самага дарагога чалавека ад пакут. Верш ад пачатку і да канца пранізаны ўласным перажываннем і любоўю да сына. Тэма твора – перажыванні маці за сына. Ідэя верша – маці заўсёды беражэ сваё дзіця ад усіх пакут на свеце. Рыфма дапамагае стварыць гарманічнае гучанне, падкрэсліць пачуцці любові і клопату да сына.

Алена Багамолава перадае ўласныя перажыванні праз вобразна-выяўленчыя сродкі. Так, перыфраза дапамагае чытачу ўявіць планету Зямля ў патрэбным пісьменніку

свеце: *Каб на* ***самай жывой з планет***. Перыфраза ў вершы выкарыстана, каб зрабіць выраз больш цікавым, незвычайным і запамінальным. Аўтар імкнецца падкрэсліць асаблівую значнасць і ўнікальнасць планеты Зямля, якая з’яўляецца адзінай вядомай планетай, дзе існуе жыццё ў розных формах. Гэта падкрэслівае ўнікальнасць і каштоўнасць нашай планеты ў параўнанні з іншымі.

Метафары, якімі насычаны мастацкі твор, выкарыстоўваюцца аўтарам, каб стварыць фон верша, прывесці чытача ў неабходны эмацыйны стан. Яны дапамагаюць выказаць пачуцці любові і перажывання ў адносінах да сына, падкрэсліць яго важнасць для маці. У прыкладзе *А* ***я берагу твой сон*** метафара ілюструе маці, якая, беражліва ставячыся да сну сына, паказвае сваё жаданне абараніць самага дарагога чалавека ад усіх небяспек і цяжкасцей. Метафара *А* ***я берагу тваё шчасце*** падкрэслівае, што для маці шчасце сына з’яўляецца найважнейшай каштоўнасцю і яна гатова прыкласці ўсе намаганні, каб яго забяспечыць.

Ва ўрыўку *Каб ніколі* ***не трапіў ты ў палон / Раўнадушша людскога нянасця*** метафара апісвае важнасць не трапіць у стан раўнадушша, які можа быць “палоном” для чалавека, перашкаджаючы яму жыць паўнавартасным жыццём. Метафара заклікае да актыўнага пошуку шчасця і сэнсу жыцця. Пісьменніца падкрэслівае, што маці хоча абараніць сына ад цынізму і бяздушнасці сучаснага грамадства. Метафара *А* ***я берагу твой свет*** падкрэслівае, што маці не толькі клапоціцца аб фізічным дабрабыце свайго сына, але і імкнецца захаваць яго ўнутраны свет: мары, надзеі і каштоўнасці. Гэта падкрэслівае глыбокую сувязь паміж маці і сынам.

У прыкладзе *А* ***я берагу тваю веру*** метафара паказвае, што вера ўключае у сябе не толькі рэлігійны аспект, але і надзею, упэўненасць у сваіх сілах і веру ў людзей. Маці імкнецца захаваць у сыне гэты духоўны аспект, які дапаможа яму пераадолець жыццёвыя цяжкасці. Метафара *Ты зведаў* ***шчасце людскога даверу*** падкрэслівае важнасць чалавечых адносін і ўзаемадзеяння. Аўтар заклікае сына адкрыцца свету, прыняць любоў і падтрымку ад іншых людзей, а таксама зразумець, што давер – гэта аснова здаровых і шчаслівых адносін.

Анафара, ужытая ў пачатку радкоў, падкрэслівае галоўную думку твора і ўзмацняе эмацыянальнасць выказвання:

**А я берагу** твой сон!
**А я берагу** тваё шчасце,
Каб ніколі не трапіў ты ў палон
Раўнадушша людскога нянасця.
**А я берагу** твой свет,
**А я берагу** тваю веру,
Каб на самай жывой з планет
Ты зведаў шчасце людскога даверу.

Такім чынам, анафара ўзмацняе сувязь паміж лірычным героем і сынам. Паўтарэнне стварае адчуванне інтымнасці, клопату і абароны. Маці імкнецца забяспечыць сыну шчаслівае жыццё, пазбаўленае раўнадушша і недаверу.

Абстрактныя назоўнікі *сон, шчасце, нянасце, свет, вера, давер, мальба* уплываюць на перадачу агульнага настрою верша. Яны перадаюць эмацыйны стан лірычнага героя, яго імкненне да абароны і падтрымкі свайго сына. Верш насычаны дзеясловамі ў форме абвеснага ладу: *берагу, не трапіў, зведаў, бярог, прашу*. Пры іх дапамозе ствараецца дынамічная карціна ўнутранага свету лірычнага героя, яго страхі, надзеі і жаданні. Яны дапамагаюць чытачу лепш зразумець, як моцна маці перажывае за будучыню свайго сына і якую адказнасць яна адчувае.

Рытарычны вокліч, які ўжываецца ў вершы, перадае пачуцці любові і перажывання лірычнага героя за сына, узмацняе эмацыйны настрой выказвання: *А я берагу твой сон! Няхай будзе з табою Бог!*

**Заключэнне.** Такім чынам, у вершы "Сыну" Алены Багамолавай адлюстроўваюцца перажыванні маці, якая імкнецца абараніць свайго сына ад усіх жыццёвых пакут. Інтымная лірыка ў спалучэнні з філасофскімі разважаннямі стварае ўнікальную атмасферу, у якой любоў і клопат маці становяцца цэнтральнымі тэмамі. Праз мастацкія сродкі пісьменніца выяўляе глыбіню сваіх пачуццяў, перадае чытачу эмоцыі, з якімі можа сутыкнуцца кожны. Выкарыстанне моўна-стылістычных сродкаў спрыяе ўдасканаленню сэнсавага плана, дзе любоў маці да сына становіцца цэнтральнай тэмай, стварае гарманічнае гучанне і выразнасць мастацкага твора.


1. Архіў вершаў А.М. Багамолавай (у электронным выглядзе). – 41 с.
2. Рагойша, В.П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В.П. Рагойша – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 384 с.
3. Стылістыка мастацкага тэксту: метадычныя рэкамендацыі / склад. Г.К. Семянькова. – Тэкст: электронны // Рэпазіторый ВДУ імя П.М. Машэрава. – URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/28226 (дата звароту: 07.03.2025). – Электр. копія друк. выд.: Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. 47 с.


## АКСІЯСФЕРА ЎЗАЕМААДНОСІН ТВОРЧАЙ АСОБЫ З ГРАМАДСТВАМ У РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА «ЛЕАНІДЫ НЕ ВЕРНУЦЦА ДА ЗЯМЛІ»


***Вараб'ёва А.Д.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Навасельцава Г.В., канд. філал. навук, дацэнт


Творчая дзейнасць з'яўляецца важным інструментам выражэння духоўна-маральных ідэалаў народа. Вобраз творчай асобы з'яўляецца неад'емным кампанентам аксіясферы духоўнага жыцця беларусаў. У айчыннай літаратуры творчай асобай можа быць прадстаўлены не толькі мастак слова, але і літаратурны крытык, рэдактар, прадстаўнік любой творчай прафесіі.

Вобраз творчай асобы паслядоўна прадстаўлены ў творах айчыннай літаратуры на розных этапах яе развіцця. У рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі» У. Караткевіча значная аўтарская ўвага скіраваная на асобу Андрэя Грынкевіча [1]. Актуальнасць нашай работы абумоўленая тым, што названы вобраз з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных інструментаў фарміравання духоўна-маральных ідэалаў школьнікаў, а таксама нацыянальнай самасвядомасці маладога пакалення беларусаў. Мэта даследавання – на прыкладзе вобраза Андрэя Грынкевіча з рамана У. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі» раскрыць аксіясферу ўзаемаадносін творчай асобы з грамадствам.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з'яўляецца раман У. Караткевіча «Леаніды не вернуцца да Зямлі», выкарыстаны апісальны метад з элементамі кампаратыўнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вобраз творцы ў літаратурнай спадчыне вядомага беларускага пісьменніка У. Караткевіча займае важнае месца. Ён прадстаўлены ў такіх вершах, як «Радок бяззбройны і бясспрэчны» [2], «Фантазія» [3], а таксама празаічных творах, напрыклад, лірычным рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі». У названых мастацкіх творах вобраз мастака рэпрэзентуецца па-рознаму. Так, у вершы «Радок бяззбройны і бясспрэчны» і рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі» пісьменнік паўстае моцным і аснова яго сілы – у першую чаргу ў цеснай сувязі са сваім родным краем. Такім чынам наш зямляк У. Караткевіч акрэсліў, што прызначэнне і місія пісьменніка ў тым, каб служыць народу, быць выразнікам яго думкі.

У вершы «Фантазія» У. Караткевіч паказаў сітуацыю, пры якой вядомыя нам прадстаўнікі творчай дзейнасці з'яўляюцца забытымі і трапляюць у «Клуб адрынутых». І, нягледзячы на тое, што пісьменнік паказаў такое, здавалася б, сумнае развіццё падзей, ён увасобіў у вершы ідэю, што мастакі ў першую чаргу вартыя павагі, гонару, шчасця.